5. *Ржавуцкі, М.* Беларуская гліняная цацка / М. Ржавуцкі. – Мінск : Полымя, 1991. – С. 142.

6. *Сахута, Я. М.* Беларуская народная гліняная цацка / Я. М. Сахута. – Мінск : Полымя, 1982. – 14 с.

7. *Сахута, Е. М.* Расписные ковры Витебщины / Е. М. Сахута // Декоративное искусство СССР. – 1984. – № 12. – С. 42–43.

8. *Сахута, Я. М.* Беларуская народная кераміка / Я. М. Сахута. – Мінск : Полымя, 1987. – С. 106.

9. *Сахута, Я. М.* Народнае мастацтва Беларусі : манагр. /Я. М. Сахута. – Мінск : БелЭн, 1997. – 287 с.

10. *Цітоў, В. С.* Народная спадчына : матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці / В. С. Цітоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 300 с.

УДК 391:687.4(476)

**М. М. Віннікава,**
*кандыдат мастацтвазнаўства, старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

# ВЫВУЧЭННЕ І ПРЭЗЕНТАЦЫЯ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ СПАДЧЫНЫ – ШЛЯХ ДА ЗАХАВАННЯ І РАЗВІЦЦЯ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ

**Анатацыя.** *На прыкладзе працы над навуковымі рэканструкцыямі лакальных варыянтаў беларускага народнага касцюма паказана цесная ўзаемасувязь матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Высветлена, што вывучэнне і прэзентацыя нематэрыяльнай спадчыны мае важнае значэнне для захавання і равіцця традыцыйнай беларускай культуры.*

**Ключавыя словы:** *традыцыйная культура, нематэрыяльная спадчына, беларускі народны касцюм, жаночы галаўны ўбор.*

**M. Vinnikava,**
*PhD in Art Criticism, Senior Researcher of The State Scientific Institution "The Centre for Belarusian culture, language and literature Research of the National Academy of Sciences of Belarus", Minsk, Republic of Belarus*

**Abstract**. *The close relationship between tangible and intangible cultural heritage is shown on the example Трубаof work on scientific reconstructions of local variants of the Belarusian national costume. It was found that the*

*study and presentation of intangible heritage is important for the preservation and development of traditional Belarusian culture.*

**Key words:** *traditional culture, intangible heritage, Belarusian folk costume, women's headdress.*

Адной з асноўных рыс традыцыйнай народнай культуры з’яўляецца сінкрэтычная цэласнасць, цесная ўзаемасувязь і ўзаемазалежнасць яе элементаў. Пры патрыярхальным укладзе жыцця матэрыяльная і нематэрыяльная сферы народнага побыту былі непадзельнымі. Уся важная інфармацыя, у тым ліку неабходныя веды і навыкі, звязаныя з матэрыяльнай культурай: парады ў галінах гаспадаркі і хатніх рамёстваў, прыёмы вырабу і аздаблення розных рэчаў, спосабы іх выкарыстання, а таксама разнастайныя віды фальклорнай творчасці – тое, што мы адносім да нематэрыяльнай спадчыны, – перадавалася з пакалення ў пакаленне ў вуснай форме ў працэсе непасрэднага кантакту падчас сумеснай працы, сямейных звычаяў, правядзення абрадаў. Такая інфармацыя існавала разам з яе носьбітамі, але не зафіксаваная пры іх жыцці з цягам часу страчвалася. У выніку нават ацалелыя матэрыяльныя артэфакты не ў стане даць нам усю паўнату ведаў пра іх бытаванне ў культурным асяроддзі, пакуль не адноўлены іх нематэрыяльныя складнікі. Гэта цалкам адносіцца да традыцыйнага беларускага касцюма, асабліва жаночага, які ў параўнанні з мужчынскім быў больш складаным і дэкаратыўным, а кожная яго частка, акрамя практычнага прызначэння, надзялялася і іншымі функцыямі, звязанымі з міфічнымі народнымі ўяўленнямі аб жыцці чалавека і яго сувязямі з навакольным асяроддзем. У касцюме замужніх жанчын асаблівая ўвага надавалася галаўному ўбору, які абавязкова павінен быў хаваць пад сабой усе валасы.

У канцы XIX – пачатку XX ст. касцюмныя комплексы замужніх беларускіх жанчын завяршалі шматслаёвыя галаўныя ўборы, якія звычайна складаліся з прылады для стварэння прычоскі (часцей за ўсё валасы навівалі на абручык, зроблены з пасмы лёну і абгорнуты палатном), чапца, сплеценага з нітак або пашытага з тканіны, часам дадатковага цвёрдага каркаса, які надаваў пэўную форму галаўному ўбору, і доўгага палатнянага павівала ручніковага тыпу, якое на тэрыторыі Беларусі мела розныя лакальныя назвы: *плат, намёт, на́мэтка, намётка, наме́тка, сарпа́нак і інш.* Памеры, якасць палатна, характар аздаблення і разнастайныя спосабы нашэння гэтай часткі галаўнога ўбору надавалі мастацка-пластычную выразнасць і непаўторныя мясцовыя рысы ўсяму касцюму жанчын. Жаночыя галаўныя ўборы ручніковага тыпу даследчыкі лічаць агульнаславянскімі [9, с. 318]. Яны вядомы са старажытных часоў. У падобных галаўных уборах паказана жаночая частка сям’і князя Яраслава Мудрага на фрэсцы Сафійскага сабора ў Кіеве (XI ст.) [14, укл., іл. 3]. У такім жа галаўным уборы

адлюстравана княгіня Кілікія – жонка вялікага князя Святаслава Яраславіча на мініяцюры «Ізборніка Святаслава» (1073) [14, с. 165, каляров. укл., іл. 1]. Аб тым, што ў гэты ж перыяд ручніковыя галаўныя ўборы насілі жанчыны на тэрыторыі Беларусі, сведчыць археалагічны матэрыял – знойдзеныя ў пахаваннях фрагменты льняных тканін і шпількі, размешчаныя каля скроневых і патылічных касцей чэрапа [8, с. 16].

На мініяцюрах Радзівілаўскага летапісу XV ст. можна ўбачыць павітую такім галаўным уборам вялікую княгіню Вольгу [14, с. 165, укл., іл. 1]. Падобны наметцы галаўны ўбор сустракаецца на гістарычных партрэтах XVI ст.: партрэт каралевы Барбары Радзівіл, жонкі Жыгімонта Аўгуста; партрэт Кацярыны Алелькавіч (Тэнчынская) [15, с. 137], а таксама на беларускіх абразах XVII ст. з іканаграфічнымі сюжэтамі: «Нараджэнне Маці Божай», «Уваскрэшанне – Сашэсце ў пекла» і інш. [7, іл. 33, 47, 64, 66].

Шмат якія даследчыкі, што працавалі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст., адзначалі, што галаўныя ўборы ручніковага тыпу з'яўляюцца характэрнай асаблівасцю касцюма беларускіх жанчын, і больш амаль нідзе не сустракаюцца. Некаторыя з іх зрабілі каштоўныя для нас фатаграфіі беларусак у наметках [10, іл. 13–18; 12, с. 481, 482, 490; 1, с. 73–75, 144–145, 188–190, 202–203, 238–239, 244, 256, 258–260, 262–264, 270–271, 296–297, 305–306, 394, 400, 420–422, 425–426, 429–430; 11, укл. іл. 2, 3, 10–13], але ніхто не пакінуў ніводнага дакладнага апісання спосабу завівання гэтага галаўнога ўбору.

У музеях Беларусі, якія ствараліся ў асноўным у савецкі перыяд, разам з іншымі прадметамі беларускага народнага адзення захоўваецца значная колькасць наметак, але інфармацыя пра спосабы іх нашэння адсутнічае. Страчанымі бываюць і дадатковыя састаўныя часткі гэтых складаных жаночых галаўных убораў, што робіць праблематычным аднаўленне сапраўдных мастацка-пластычных адметнасцей лакальных варыянтаў беларускага жаночага касцюма. А гэта неабходна пры экспанаванні традыцыйных строяў у музейных умовах, прэзентацыі ў альбомных выданнях, а таксама пры стварэнні іх сцэнічных варыянтаў.

Між тым, як паказалі нашы палявыя даследаванні, у канцы XX – пачатку XXI ст. яшчэ можна было сустрэць інфармантаў, якія памяталі мясцовыя спосабы завівання наметак. Звычайна гэта былі жанчыны сталага ўзросту, якія самі ўдзельнічалі або былі сведкамі вясельнага абраду апранання маладой, некаторыя бачылі старых бабуль у такім галаўным уборы. З іх дапамогай былі зафіксаваны і адноўлены некаторыя адмысловыя спосабы стварэння традыцыйных прычосак і галаўных убораў у Лунінецкім, Кобрынскім, Драгічынскім, Жабінкаўскім, Маларыцкім, Ганцавіцкім раёнах Брэсцкай вобласці, Лельчыцкім раёне Гомельскай вобласці, Слуцкім і Бярэзінскім раёнах Мінскай вобласці. Атрыманыя звесткі і навыкі далі падставы для пашырэння меж даследавання і рэканструкцыі розных спосабаў нашэння жаночых галаўных убораў руч-

ніковага тыпу паводле іншых крыніц – фотаздымкаў, этнаграфічных апісанняў і замалёвак, зробленых у другой палавіне XIX – пачатку XX ст.

Вельмі каштоўныя матэрыялы для вывучэння і рэканструкцыі беларускага традыцыйнага касцюма, у тым ліку і жаночых галаўных убораў, былі выяўлены намі ў зборах розных музеяў Беларусі і Расіі. Так, Расійскі этнаграфічны музей (РЭМ) і Музей антрапалогіі і этнаграфіі імя Пятра Вялікага (Кунсткамера) Расійскаай акадэміі навук (МАЭ), што знаходзяцца ў горадзе Санкт-Пецярбургу, змяшчаюць прадметы традыцыйнага беларускага касцюма, сабраныя ў канцы XIX – пачатку XX ст. віднымі этнографамі таго часу – Е. Р. Раманавым, А. А. Мілер, А. К. Сержпутоўскім і інш. Асаблівая каштоўнасць гэтых матэрыялаў для нашага даследавання заключаецца ў тым, што некаторыя жаночыя галаўныя ўборы захоўваюцца ў фондах названых музеяў у неразабраным выглядзе, што дало магчымасць найбольш дакладна рэканструяваць спосабы іх стварэння і нашэння, а архіўныя запісы і фатаграфіі дапамаглі ўдакладніць месца іх бытавання.

Напрыклад, паводле музейнага прадмету са збору РЭМ (Кал. № 8762-12158/1,2), які ўяўляе сабой тонкую, туга накрухмаленую наметку, што захоўваецца ў сабраным выглядзе і паходзіць з тэрыторыі Беларусі, нам удалося рэканструяваць спосаб яе завівання, а па фатаграфіях Дзмітрыя Георгіеўскага ўдакладніць месца былога бытавання гэтага галаўнога ўбору (ім аказалася Піншчына). Реканструяваны спосаб нашэння галаўнога ўбору быў апублікаваны ў «Традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў» [2, с. 666–667]. Ён зацікавіў жанчын з в. Пінкавічы Пінскага р-на Брэсцкай вобл. – удзельніц фальклорнага гурта «Крыніцы». У кожнай з іх захоўвалася бабуліна або матуліна наметка, але завіваць яе ніхто ўжо не ўмеў. Паездка ў Пінкавічы і правядзенне аўтарам дадзенага артыкула майстар-класа для ўдзельніц гурта «Крыніцы» вярнула ім страчаныя веды. А выкарыстанне завітых наметак падчас іх фальклорных выступленняў і правядзення традыцыйных абрадаў надало іх касцюмам яскравы мясцовы каларыт. Візіт у Пінкавічы меў і іншы плён: быў сабраны новы каштоўны навуковы матэрыял пра традыцыйнае адзенне і звычаі жыхароў гэтай вёскі, а для музейнай калекцыі аддзела старажытнай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі была перададзена аўтэнтычная наметка, выраблeная ў пачатку XX ст. Яна завяршыла жаночы строй Піншчыны, астатнія прадметы якога ўжо знаходзіліся ў музейным зборы аддзела. Гэта дало магчымасць прадставіць пінскі строй у музейнай экспазіцыі і адлюстраваць у альбоме, прысвечаным традыцыйнаму беларускаму адзенню [3, с. 92–93, 96–97, 100].

Звесткі, атрыманыя намі падчас палявых даследаванняў, артэфакты з музейных калекцый, архіўныя фатаграфіі, якія выкарыстоўваліся ў пошуках страчанай матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны, дапамаглі

ўдакладніць раней зробленыя рэканструкцыі лакальных варыянтаў беларускага традыцыйнага касцюма, створаныя на падставе фрагментарных дадзеных і славесных апісанняў, і нават аднавіць асобныя страчаныя строі, надаць ім новае жыццё і прэзентаваць у навуковых і альбомных выданнях. Так атрымалася з жаночымі касцюмамі Тураўшчыны, дзе яшчэ ў пачатку XX ст. выкарыстоўваліся вельмі цікавыя «рагатыя» галаўныя ўборы [5; 3, с. 182]. Аб'яднанне асобных звестак, атрыманых ад інфармантаў і сабраных у розных музеях Беларусі і Расіі, дазволіла цалкам аднавіць жаночы касцюм з адмысловым галаўным уборам, які бытаваў у наваколлі в. Церахоўкі (зараз у Добрушскім р-не Гомельскай вобл.) [6, с. 345; 3, с. 208]. Паводле фотаздымкаў В. К. Косткі быў рэканструяваны спосаб нашэння жаночага галаўнога ўбору з в. Званец Рагачоўскага павета Магілёўскай губерні, а дадаткова сабраны ў музеях Беларусі матэрыял па асобных частках жаночага адзення з тэрыторыі Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. дазволіў аднавіць увесь строй [4; 3, с. 218].

Як паказала практыка, даследаванні ў галіне нематэрыяльнай спадчыны ўносяць значны ўклад у справу вывучэння, захавання, прэзентацыі і трансляцыі нацыянальных культурных каштоўнасцей. Традыцыйны касцюм – адзін з кірункаў такіх даследаванняў. Вынікі праведзенай працы знаходзяць увасабленне ў музейнай, адукацыйнай і асветніцкай дзейнасці, выкарыстоўваюцца пры падрыхтоўцы альбомных выданняў [3; 13, с. 30–31, 38–41, 44–45, 50–53, 60–61, 66–67,78–81], што садзейнічае павышэнню цікавасці да традыцыйнай культуры беларусаў, яе папулярызацыі і сучаснаму развіццю.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


*1.* Беларусы ў фотаздымках Ісака Сербава. 1911–1912 / склад., аўт. уступ. артыкула В. А. Лабачэўская; рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2012. – 456 с. : іл. – (Энцыклапедыя рарытэтаў).

*2. Віннікава, М.* Традыцыйнае адзенне / М. М. Віннікава // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / А. М. Боганева [і інш.] ; пад агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Т. 4 : Брэсцкае Палессе : у 2 кн. – Кн. 2. – Мінск : Выш. шк., 2009. – 863 с.

*3. Віннікава, М. М.* Традыцыйны беларускі касцюм = Традиционный белорусский костюм = Traditional belarussian costume : альбом / М. Віннікава, П. Богдан. – Мінск : Беларус. навука, 2016. – 302 с. : іл.

*4. Винникова, М. Н.* Значение полевых материалов В. К. Костко для современных исследований в области традиционного белорусского костюма / М. Н. Винникова // Вещи. Экспедиции. Музеи. К 100-летию со дня рождения Т. В. Станюкович (1916–1992) / отв. ред.: Н. П. Копанева, Л. С. Лаврентьева, М. В. Станюкович. – СПб., 2019. – С. 57–70.

5. *Винникова, М. Н.* О реконструкции смыслового значения и способов ношения женских головных уборов Туровщины (по материалам белорусской коллекции МАЭ) / М. Н. Винникова // Сб. Музея антропологии и этнографии им. Петра Великого Рос. акад. наук / Рос. акад. наук, Музей антропологии и этнографии им. Петра Великого. – СПб., 2011. – Т. 57 : Культурное наследие народов Европы. – С. 93–110.

6. *Винникова, М. Н.* Реконструкция локальных вариантов традиционного белорусского костюма с использованием материалов из собраний музеев России и Беларуси / М. Н. Винникова // Сб. Музея антропологии и этнографии им. Петра Великого Рос. акад. наук / Рос. акад. наук, Музей антропологии и этнографии им. Петра Великого. – СПб., 2013. – Т. 58: Европейское культурное пространство в коллекциях МАЭ. – С. 325–359.

7. *Высоцкая, Н. Ф.* Жывапіс Беларусі XII–XVIII стагоддзяў / Н. Ф. Высоцкая, Т. А. Карповіч. – Мінск : Беларусь, 1980. – 316 с.

8. *Дучыц, Л. У.* Касцюм жыхароў Беларусі X–XIII стст. / Л. У. Дучыц. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 80 с.

9. *Зеленин, Д. К.* Женские головные уборы восточных (русских) славян / Д. К. Зеленин // Slavia časopis pro slovanskou filologii. – Praga, 1926. – Ročnik V, Sešit 1. – С. 303–338.

10. *Костко, В. К.* Снимки по этнографии Могилевской губернии : альбом / В. К. Костко. – СПб., 1903. – Т. 1. – 448 с.

11. *Лабачэўская, В. А.* Захавальнік Палескага музея Дзмітрый Георгіеўскі: Да 75-годдзя адкрыцця музея ў Пінску / В. А. Лабачэўская. – Мінск : Тэхналогія, 2001. – 82 с. : іл.

12. *Лысенко, О. В.* Этномузеологическое наследие А. К. Сержпутовского: к публикации рукописи «Полешуки-белорусы» / О. В. Лысенко // Материалы по этнографии. – СПб., 2010. – Т. 3 : Народы Белоруссии, Украины, Молдавии. – С. 353–490.

*13.* Народнае мастацтва Беларусі XVI–XXI стст. Кераміка, мастацкія тканіны, разьба і роспіс па дрэве, саломапляценне і інкрустацыя = Народнае искусство Беларуси XVI–XXI вв. Керамика, художественные ткани, резьба и роспись по дереву, соломоплетение и инкрустация = Folk art of Belarus in the $16^{th}$ – $21^{st}$ centuries Pottery, Fabrics, Wood Crafts and Straw Crafts / Нац. маст. музей Рэсп. Беларусь ; рэд. савет: У. І. Пракапцоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2022. – Кн. II. – 360 с.

14. *Пушкарева, Н. Л.* Женщины Древней Руси / Н. Л. Пушкарева. – М. : Мысль, 1989. – 287 с.

15. *Smoliński Józef.* Kaptur i namitka // Ziemia, 1911. – T. II. – Wyd. 8. – S. 136–138.